# ЭТНОГРАФИЯ

УДК 398 (=161.3)

## ПАДНАШЭННІ І АБЯРЭГІ, ЗВЯЗАНЫЯ Ў НАРОДНАЙ СВЯДОМАСЦІ З МЛЫНАРАМІ (ПАВОДЛЕ ФАЛЬКЛОРНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ ПІНШЧЫНЫ)

***А.М. НЕНАДАВЕЦ***
*Бабруйскі філіял Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта,*
*г. Бабруйск, Рэспубліка Беларусь*

Працягвае здзіўляць тое, што шматлікія вуснапаэтычныя матэрыялы, палявыя запісы і сведчанні даследчыкаў падкрэсліваюць выразныя раннеязычніцкія карані абрадаў і магічных дзеянняў, звязаных з дзейнасцю млынароў. Самае цікавае заключаецца ў тым, што праз стагоддзі захаваліся найбольш характэрныя рысы і ўласцівасці. Бясспрэчна, нешта беззваротна адмерла, знікла назаўсёды, але тое, што засталося і жыве ў народнай памяці, таксама мае даўнія карані. Вывучэнне гэтых каранёў, спроба дакапацца да першавытокаў – вось асноўная задача міфолагаў, бо без гэтых, здавалася б, драбніц нельга стварыць стройную сістэму дэманалагічнага і міфалагічнага свету далёкай мінуўшчыны. Немалаважна і тое, што апошнім часам цяга да даўніны сярод вучоных-грамадазнаўцаў узмацняецца. Хацелася б абавязкова адзначыць наступны факт – у беларускім народзе чамусьці былі цвёрда пераканаsuccessfully ў тым, што калі млынару, напрыклад, прыносілі паднашэнні ці карысталіся нейкім канкрэтным абярэгам (родавым ці сямейным – не мела вялікай розніцы), то гэта засцерагала не толькі ад уздзеяння нячыстай сілы, але і ад усемагчымых іншых дэманалагічных праяў і ад чорных вачэй самога млынара таксама. Чым іншым можна растлумачыць той факт, што мясцовыя жыхары, пасля таго, як адносілі паднашэнні ці непрыкметна апраналі або надзявалі свае абярэгі, захоўвалі іх за пазухай ці ў кішэні, адразу ж спакойна ўздыхалі і адчувалі сябе непадуладнымі чартоўскай сіле. «Няма чаго баяцца, калі ўсё выканаў, як таго патрабавала традыцыя. Нас жа раней навучалі ў абавязковым парадку млынару рабіць паднашэнні. У якасці такога падарунка можна было выкарыстаць нешта з хатніх рэчаў ці з прадуктаў. Некаторыя, праўда, насілі грошы. Гаварылі яшчэ, што старыя млынары грошай не прызнавалі. Яны адназначна сцвярджалі, што грошы губяць іхнюю чарадзейную сілу, не даюць ёй памнажацца. Таму стараліся грошай не браць. У якасці платы не толькі бралі, але і патрабавалі, а вось у якасці паднашэнняў то не. Пра абярэгі таксама паўсюдна згадвалі і сцвярджалі адназначна, што перад паездкай на млын, у абавязковым парадку неабходна вешаць на шыю ці некуды хаваць у сваю вопратку хатні абярэг, які выручыць мог паўсюдна гаспадара і ягоную сямейку, бо быў ён моцна намолены. А раз так – то і ўсезасцерагаючым» [1,с.119]. Дзейнічаючы па прынцыпу, «я табе паднашэнне-падаруначак, а ты да мяне станеш лепей адносіцца», сяляне ні ў якім разе не забываліся і пра тое, што такі «аднос», «падкід» можна здзейсніць незаўважна ад, здавалася б, усёвідушчых вачэй млынара. Магло падацца і на самой справе, што чалавек, які прыехаў на памол, пакінуў нейкую рэч ці прадмет не спецыяльна, а зусім выпадкова. Тады такі прадбачлівы гаспадар увогуле нічым не рызыкаваў, нават калі б млынар аб нечым і здагадваўся. Спаслацца можна было і на ўзрост, і на стомленасць, і на абыякавасць. Як ні прыдзірайся, а агаворка сапраўды атрымліваецца важкая. «Як да таго мельніка ехалі, да яго млына, то старшых прасілі падсказаць, што там да чаго. Некаторые жэ людзі проста баяліся Максіма, і таго баяліся, што пра таго ведзьмара расказвалі ў вёсцы. Нас маці-нябожчыца падвучвала. Ена многае такое знала, што ад злога вока да ад завісці надзейно выручало. Максім той, як маладым быў, то да нашай мамы, нібы-то, сватаўся, але бацькі дыбом сталі. Сама маці ніколі такого не ўпомінала, але ж от людзей не сховаеш. То яна сама советовала нам такое: станеце свої мешкі з мукою завязваць, штоб вынасіць да на воз грузіць, то пастарайцеся, незаметненько трошкі мукі высыпаць прамо ў млыне на подлогу. Многа не трэба, каб не дагадаўся. Жменьку-другую і ўсё на тым. Ён жа жадный быў, то людзям заезджым нікогда не даваў дажэ ля своїх мешкоў падметаць. Усё, што высыпалася праз якую дзірку ці ненароком, лічылася яго, гаспадарова. Праўда, маці казала і яшчэ пра адно: штоб ні ў якім разе на тую муку сам чалавек не наступіў. Такой оберег нам расказвалі. Помогаў, відно, сільно, потому што ні разу ў нас з-за того мельніка нічого плохого не случалось»[АПЗ(1)].



ПолесГУ

Яшчэ адзін з запісаў сведчыць пра тое, што муку сапраўды стараліся любым чынам пакінуць, але рабілі гэта не ў сярэдзіне млына, а па-за ягонымі сценамі. Заходзілі з тыльнага боку і высыпалі крышку мукі пад левы вугал забудовы. Гаварылі і пра тое, што муку адсыпалі не проста пад вугал, а на ніжнія тры бярвенні (лічачы ад зямлі). Найбольш вопытныя не толькі здзяйснялі такое з мукою, але яшчэ пры гэтым шапталі і словы замовы. Запісаны намі вуснапаэтычны твор і назву носіць сімвалічна-адпаведную «Ад злога ведзьмавання», што лішні раз падкрэслівае яе «агульны» характар». «Максіма запросто можно было провесці. Глаўное было знаць, як усё гэто обробіць, штоб ні ў якім разе не догадаўса, бо калі б знайшоў, то быў бы ў своім ведзьмарстве да ўсім страшным. Там ужо не тое, што позаклінаў бы, але і яшчэ б попроклінаў наўсягда. Трэба было ўзяць крыху мукі ў кішэню і, падабраўшы случай, зайсці за одворотны бок млына. Як туды ціхенько прокраўса, то той мукой необходно было обсыпаць ля левого вугла тры ніжнія дзеравіны. Обсыпаў,одыйшоўса крыху, штоб не ўбачыў мельнік ці хто іншы, і не заходзь одразу ў млын, а про сябе спокойно ўжэ, не выдыючы сэбэ, проговоры замову од врагоў, якія табе ніколі і нідзе не спрыяюць: першым разком, божым часком, Бог с помоччу, а я со своімі словамі. Одкуль сонцэ ўсходзіць, з того боку і ясен месяц усходзіць, з того боку Божа мацер на мой двор прыходзіць. На Наталліным дворы прэстол божый стоіць, за прэстолом Божа Маці сэдзіць, у руках своіх трымае тры по дзевяць золотых ключэй. Замыкае яна свою господарку от чародзея і од ведзьмы-чародзейніцы, от самого ведзьмака і от ведзьмачкі, от колдуна і от колдункі, от злых вочэй і от плохіх вочэй. Замыкае ёна на замкі жолезные і бросае золотые ключы ў сіне морэ-окіян, под велізный камень Латыр, які на дне божэм ляжыць, слово моцное трымаець, сілу чародзейную ні ў якім разе гуляць не выпускаець. Як под тым велізарнейшым каменем Латыром морэ не высыхае, так тым чароўнікам, чароўніцы, ведзьмаку, ведзьмачцы, колдуну, колдунні, злым усім людзям-нелюдзям золотые тыя ключы ні ў якіе векі не достаць. Быць моему ўсему цэлу і здорову, прыплодному і ўроджайному, вэсёлому і гуллівому. На гэтом свою замову заканчваю і ўсімі святымі её закрэпляю. Амінь. Амінь. Амінь» [АПЗ(2)].

У в.Чухава ўдалося запісаць і яшчэ адзін своеасаблівы абярэг. Пры гэтым, з аднаго боку, ён звязаны з верай у цудатворную сілу і святасць хлеба, а з другога,быццам бы яшчэ падкрэсліваецца, што гэтая святасць пераходзіць таксама і на прадметы, якія так ці інакш звязаны з хлебам, з яго выпяканнем (хлебная лапата, хлебная дзежка, хлебная формачка-каравайніца і г.д.). Да гэтых прадметаў на Палессі сапраўды заўсёды адносіліся з шанаваннем, у многіх выпадках амаль персаніфікуючы іх, уводзячы з шматлікімі магічнымі дзеяннямі і характэрнымі рысамі ў багатыя народныя звычаі і абрады (купанне дзіцяці, саджанне нявесты на хлебную дзежку, купанне хворага дзіцяці ў хлебнай дзежцы). «Пачынаўшы класці мяшкі со збожыною на воз, коб ехаць до млына, дзед на ніз, ззаду, браў і под сіно ховаў маленькую хлебную дзежочку. Ёно то і не под хлеб назначалася, а под блінцы. Баба ў ёй заўсегда цесто месіла, матка моя. Нэвелічкая такая, усёго на якіх поўведра ці што. Жончыны ёю ў хаце вельмі дорожылы. Над ёю молітвы шэпталіса, перохрышчвалі цесто і самі заўсягды перохрышчваліса. Дзед жэ ўсім казаў, што ёна ёму допомогае од того, коб добрэ доехаць до млына, дробно-мелко змолоць і шчасліво вернуцца обратною дорогою. Не раз і чула сама, як старый і тату моёму поціху поўтораў, штоб і вун ніколі не забываўса про ўсё гэто. Тогда ніякій Максім не здолее ворожыць. Вун жэ кідаўса і вэдзьмоваў на тых, якія нэ моглі зашчыту собі знайсці, нічого не мелі, а, можэ, по дурноце ўласнуй одмовіліса, ці посміяліса з людзей, якія і іх, дурней, доброму да шчырому навучалі. Колі старый домоў прыездждаў, то дзежочку тую, пошэптаўшы нешто над ёю, чысто выціраў зверху дзеружкою, якою воз з мэшкамі накрываў. Але робіў гэто только зверху, з сэрэдзіны нэ чэпаў. Оддаваў бабе і пры гэтым дзяковаў яе, што зноў усё збэрэглоса і ўбэрэглоса. Тая дзежочка ў нас ці не сто годоў вэласа, потом ужэ ў войну згорэла разом з хатою і з усім чысто хатнім начыннем. Не ўспелі нічого выхопіць. Добрэ. што хоць самі неяк поратовалыса. Не до дзежочкі там было » [АПЗ(3)].

Наш інфарматар У.Ф.Сыцэвіч падкрэсліваў, што яго дзед вучыў свайго сына, каб той перад паездкай на млын аберагаўся і засцерагаўся не толькі сам, але і таксама абавязкова думаў пра сямейку, пра родных, пра... кабылку, якая павязе на хутар збожжа. Для гэтага дзед браў рэшткі цеста з хлебнай дзежкі і нёс іх да воза. Палову аддаваў адразу ж кабыле, а другую – старанна хаваў паміж мяшкамі. « Маці чысценько дзежочку вышкрабала і ў місочку складвала, а потым дзеду ў двор выносіла. Ён з такога цеста зробіў, як два невялічкія блінцы і одзін сразу нашай гнедой кобыле оддаў. Другі ж под ніжні мешок на возе поклаў. Ешчэ й проверыў, штоб не відаць было. Гэто ён так до нашого мельніка ездзіў. На той хутор, што і цяпер зямля Мікештыною завецца. Самога того мельніка звалі Максімом. Его сільно-сільно бояліса, што ж ведзьмоваў надто на людзей. Кому як захочэ досадзіць, то хоч ты ховайса, хоч ты под зэмлю закопвайса, а ён свойго дойдзе і нікуды ты не дзенешса. Каб жа толькі одзін раз, ці на одного чаловека, а то і на ўсю его родню перакінецца. З-за

Полесгу

гэтого і дзед наш оберэгаўса хлебом святым. Не раз і нам казаў, што любы знахар перад хлебом сілу губляе, нікуды не годным становіцца. Што з блінчыком тым потым робіў? Як дохаты прыезджаў і ўсё ў ёго благополучно проходзіло, то і тое, остатнее цесто кобыле оддаваў»[АПЗ(4)].

Звесткі аб найбольш арыгінальным і, напэўна, самым распаўсюджаным абярэгу ад чараўніцтва млынара, як нам здаецца, утрымлівае наступнае сведчанне: «Калі ехалі нашы мужчыны з дому до млына, то собіраліся стараючыся, штоб нічого не пропусціць. Што добрэ помню, так гэто тое, як ёны на дугу ленточкі вешалі. З чого былі тые ленточкі? А такіе вузенькіе полосочкі матерыі, толькі што з разноцветных небольшых кусочкоў. Неколькі штук вешалі. Недзе штук 6 ці 9. По-мойму, 9 вешалі. Раз запытаўса – нашто такое робяць? То мне со смехом одказалі, што не бойса, не на весэлле поедзем, а до млына, на хутор. Казалі, што на хутор. А сам млын стояў на рэцэ Вісліцы. Там і до нашого дня яма ёсць.Млыновою зовецца. Там той Максім своё дзело трымаў. До ёго як ехалі, то тых ленточок не чэпалі. Затое, як назад ворочаліся, то стараліся тыя ленточкі поздымаць і повешаць на молодыя осінкі, якія ўздоўжкі дорогі рослі. Тыя дзерэўца былі шчыро ўбраны такімі полосочкамі, як под Новый год елінкі. Толькі ўселякій раз малых і молодых поросцерагалі, каб ні ў які м разе до тых ленточок не докраналіся, не здымалі іх, бо з імі разом запросто могла перэкінуцца хвороба, несланая мельніком, ці ешчэ якая ведзьмарская штучка»[АПЗ(5)]. У некаторых выпадках сцвярджалі, што касныкі з дугі ці з хамута на зваротнай дарозе ад млынара здымалі і вешалі, толькі ўжо не на асіну (асінкі), а на старую ляшчыну (арэшыну). Некалькі разоў сам спецыяльна прыязджаў на гэтае месца. Самае цікавае, што зараснікі арэшніку густа разрасліся там і зараз, але ніякіх слядоў ад былых абярэгаў адшукаць не ўдалося. Час разбурае не толькі магутныя замкі, але і паданні ды легенды. Не пакідае камяня на камяні ад захапляльных вуснапаэтычных твораў, ад найцікавейшых успамінаў: «Як ехалі до мліна, то на дугу вешалі розноцветныя коснычкі. Муку змелюць, од мельніка прыхаваючыса одсыплюць і ёму, штоб на далейшое быў лепшым, за вугол трошкі і после гэтого домоў кіруюць. На жоўтой выспе, дзе дорога вельмі песчаная і цяжкая для коней была, у одным месцы рос пышный куст орэшніку. Усе ёго, няйначай, як ведзьмаровым і называлі. Нікому не казалі, штоб з ёго орэхі рваў. Куст быў закляты тым чортом Максімом. Тому, як мыналі, то спынялыса і ўсе чысто ленточкі тыя з дугі перовешвалі на орэшыну. Потым кланялыса ёй і ехалі далей, як ні ў чым не бувало. Прыедуць, праўда, то дома, воза не разгружаючы, сначала молітву прочытаюць, а потом ужэ мешкі прыбіраюць з возу. Якая б погода нэ стояла, але ўсё роўно такого порадку трымаліса » [АПЗ(6)]. Немалаважным лічылі і тое, як весці сябе сялянам на млыне, як павінны былі баяцца зрабіць лішні крок, таму што за празмерную цікаўнасць пагражала непазбежная адплата. Нашым продкам быў вядомы (і цалкам даступны) даволі багаты і разнастайны пералік абярэгаў: у іх ліку ўсемагчымыя прыпаркі, перавязкі, гарачыя («выпарваючыя») лазні, кровапусканні і г.д. Патрыярхальныя людзі выпрацавалі цэлую сістэму, у якой цесна і рознапланава перапляліся рытуальна-магічныя дзеянні. У аснове такіх дзеянняў (абрадаў) ляжыць шматвяковы вопыт папярэдніх пакаленняў. Неабходна падкрэсліць сам факт «пастаянства», «нязменнасці» (ці «кананічнасці») варажбы і знахарства, гэта азначае, што на працягу значнага перыяду ў гісторыі чалавецтва (увогуле) і палешукоў (у прыватнасці) мала што змянілася ў спосабах, манерах, прынцыпах аховы людзей ад уздзеяння млынароў-чарадзеяў. І чалавек далёкага мінулага, і млынар, пра якога мы расказваем і які жыў на пачатку XX стагоддзя, карысталіся ўсё тым жа рытуальна-магічным наборам. Ён мала ў чым змяніўся. Адбывалася гэта, хутчэй за ўсё, з-за таго, што яго не вельмі імкнуліся абнаўляць. Баяліся наклікаць бяду, не болей таго. За лепшае лічылі захоўваць найстражайшую кананічнасць, няхай сабе і ў наіўных дзеяннях і замовах, чым штосьці ў іх змяняць. Верылі, што калі толькі нешта змяніць, дык замова не будзе мець ранейшай вылячальнай і адпалохваючай сілы; мала гэтага, такое непажаданае змяненне, наадварот, магло прынесці яшчэ куды большыя непрыемнасці ў падтрыманні гаспадарчай дзейнасці, чым было да гэтага. Самае дзіўнае. што такі паварот справы ўспрымаўся нашымі продкамі, як справядлівае пакаранне за тое, што парушылі традыцыйнае, якое спакон вякоў лічылася непарушным. Але таксама важна прасачыць рытуальныя дзеянні варажбіта ці ведзьмака ў народным уяўленні, паказаць абарону – зберагаючыя дзеянні чалавека, які любою цаною імкнуўся не трапіць пад уплыў гэтага «ведзьмавання». Тут дапускалася ўсемагчымая варыятыўнасць, неардынарнасць і забітасць, нетлумачальнасць усяго гэтага працэсу: чаму менавіта трэба рабіць так, а не інакш?

Гарантый поўнага захавання сваёй недатыкальнасці пры дапамозе абярэга не існавала («можа дапаможа, а можа – і не, як Бог дасць»), асабліва ў тых выпадках, калі не існавала магчымасці супрацьстаяць «чорнаму» знахару, супрацьдзейнічаць яму, звяртаючыся да носьбітаў белай магіі. Узнікала сітуацыя, пры якой чалавек працы заставаўся адзін на адзін з таямнічым знахарам, сіла, магчымасці якога памнажаліся ў сотні, а то і ў тысячы разоў народнай пагудкай («не столькі ён ужо і мог. Колькі яму ўсе прыпісвалі»). Зноў жа, такому варажбіту былі «развязаны рукі», ён заставаўся

ПолесГУ

беспакараным таму, што ад яго ўсе вымушаны былі толькі абараняцца. Ніхто нават і не разважаў аб тым, каб умешвацца ў дзеянні, накіраваныя супраць жыхара вёскі. А такі носьбіт зла далёка не заўсёды дзейнічаў з нейкай канкрэтнай выгадай для сябе. Проста яму хацелася зрабіць што-небудзь на зло іншым. Такіх выпадкаў, аказваецца, вельмі многа, бо верылі, што злы знахар можа не толькі напусціць псоту на чалавека, накінуць на яго «злое чараванне», адмоўна ўздзейнічаць на хатнюю жывёлу, але і выклікаць таксама нейкія акрэсленыя непажаданыя прыродныя катаклізмы. Здаралася ў вёсках эпідэмія («пошасць»), і тады вяскоўцы адзінагалосна сцвярджалі, што тут без «нячыстай сілы» не абыйшлося, а «нячыстая сіла» ў вачах сялян амаль заўсёды асацыіравалася з тымі ж самымі «чорнымі» знахарамі. А знахара – у першую чаргу – з млынарамі. І тут ужо верылі не толькі ў магічныя словы-замовы, але і ў абрады, дзеянні, рухі, якімі іх заўсёды суправаджалі. Здаралася, і даволі часта, што нават не маглі растлумачыць, чаму тое ці іншае дзеянне ці абрад здзяйсняецца. За даўнасцю паходжання, на працягу стагоддзяў першаснасць значэння гэтых каранёў адмерла ці ўжо значна, да непазнавальнасці, трансфармавалася. Таму некаторыя выпадкі, запісаныя намі здавалася б зусім нядаўна, усё роўна нясуць на сабе нейкую ступень нетлумачальнасці. У крайнім выпадку, інфарматары маглі толькі падкрэсліць ці неяк абагулена зазначыць: «Хто ж яго знае... Не намі ўсё так заведзена. Так нас навучылі, то і мы менавіта так пераказваем... ». Чамусьці лічылася, што знаходзячыся ля млынара, на тэрыторыі ягоных уладанняў, нельга было моцна гаварыць, а таксама хадзіць і заглядваць у розныя  куткі ягонага двара. Хутчэй за ўсё, гэтая забарона сыходзіла са старадаўніх прынцыпаў патрыярхальнай маралі: што захочуць, то табе і так пакажуць, а што схавана – то тое не шукай. Няма ў цябе на гэта правоў. «Калі ехалі ў млын да Максіма, то ўсе чысто наперод знали, што ў яго на млыне нельга громко крычаць. Але ж там і па-другому нельга было размаўляць, бо ж вада шумела, колесо тое трашчало-калацілася так, нібыто на вачах павінна было разваліцца. Можэ мельнік думаў, што колі громко говораць, то смеюцца з ягоной глухоты? Хто ж его ведае, ды на самой справе казалі, што ён ад нараджэння глуховаты быў, многого не дочуваў, а по-свойму додумваў. То за гэто і людзі ўсякія ні за што получалі чорное знахарство ў свой бок» [АПЗ(7)]; «Пойшоў одзін наш, надто ж цікаўны чоловек вокол млына ў Максіма лазіць. Ёго перод помолом поперэджвалі, казалі, што за любопыцтво можэ поплаціцца. Але ж дзе гэто вы бачылі, штоб людзі ўсіх і во ўсім слухаліся? Такого ніколі не бывало і не будзе. Так і тут отрымалосо. Вот не, штоб з другімі стояць ды глядзець спокойно, што там до чого, то ўсё поркаўса, пальцамі крутыў, вызырквав, як там ды до чого. Лазыў, лазыў і долазыўса. Максім одорваўса од своёй роботы і ў двор выглянуў. Як убачыў того чоловека, як схопіў нейкі дрын да до ёго! Хопіло тому дурню, што можэ потом і дзесятому заказаў, коб такого ў своім жыцці ёны не робілі! Мало того, што збіў ёго Максім добрэ, то ешчэ пры гэтым крычаў нэ своім голосом: «У коб тобі ногі повыкручвало! Коб тобі твоі вочы повылазілі!» Той вясковец потым ажно да скону свойго ў другі млын возіў молоць, бо вельмі бояўса, што Максім ёму егоную провіну напомніць і ешчэ возьмецца розбірацца»[АПЗ(8)].

Яшчэ адна немалаважная акалічнасць, на якую абавязкова хацелася б звярнуць увагу. У некаторых запісах інфарматары паведамлялі пра тое, што вяскоўцы ўсялякі раз, калі ехалі да Максіма, то жадалі падкрэсліць свой статус у пэўнай вёсцы. Адным словам, паказаць, якія яны заможныя ці «спраўныя» гаспадары. «Бацько, як на млын збіраўса, то до ўсёго вельмі старацельно готовіўса. Могло з якого боку подацца, што ён до цэркві куды ехаць меў ці на якое веселле. Так ужо выштукоўваў усё, да подкручваў. І на сэбэ обязацельно стараўса нэ самое худшэе надзець. Нават не гледзячы, што работа на млыне чакала яго не вельмі чыстая і запросто можно было замазацца. Ўсё раўно, як ні стараліся, як ні імкнуліся, а нешто зробіць хутчэй ці не так, прымусіць не моглі. Свойго заўсягды дзержаўса. Обязацельно боты свої обуваў. Выходзіло, што не ў лапцях ехаў, а ў ботах іменно. Праўда, не ў новых, а ў добрэ поношаных, але ж усё роўно. Дзе гэто вы бачылі, штоб тогда на якую работу дажэ богатые господары ў ботах выходзілі? Колі доставалі вельмі своімі роспытамі, то нібы одрэзваў со злосці,што гэто для того, коб мельнік на свое вочы бачыў, што я зажыточный, а не голыцьба якая-небудзь. Тогда і ён на мэнэ по-другому глядзець будзе, не стане косовурыцца да ўсім своім выглядом показваць, што без мене запросто на своім млыне обыйдзецца. Здаецца, што не толькі ў гэтым справа была. Бацько ешчэ нешто знаў, бо ж млынар і так добрэ ведаў, як у ёго справы дома йдуць і якая ў ёго господарка імеецца»[АПЗ(9)].

Згадвалі і пра тое, што паасобныя вяскоўцы нават вопратку, а не толькі абутак, выкарыстоўвалі ў якасці своеасаблівых абярэгаў ад уздзеяння чараўніцтва знахара-млынара. Мы маем некалькі такіх сведчанняў. Атрымлівалася, што ў спрактыкаваных сялян у свірне вісела спецыяльная вопратка, якою гаспадар карыстаўся толькі пры паездцы на млын і не болей таго. «Неколі, добрэ гэто помню, бо ж на моіх вочах усё робілоса, хоць і малы быў, але ўчэпістый на памяць. Так вот, дзед, як збіраўса на млын до Марціна ехаты, то прамо ў свірны пероодзеваўса. Самое голоўное, што зачыняўса, коб ніхто

чужый гэтого нэ ўбачыў. Мене ж хлопцы старэйшыя подговорылі заглянуць. Сказалі, што дзед там з суседкою зачыніўса. Я й полез у шчылінку зазіраць. То й получыў од старого. Пугою ледзьве вушы мне не позакручваў навыворот. Ссек на горкій яблык! Бацько выпадково нарваўса да ўступіўса. Але ўсё роўно, запомніў я тое на ўсё жыццё. Вечором почуў, як дзед стаў говорыць, нібыто до своіх дзецей, моіх бацькоў, але гэто для мене, дурня, робіў, што ў свірне ў ёго вісіць пасконная сорочка і крамные штаны, якіе ён одзевае толькі до млына едучы. Казаў, што як дохаты вертаецца, то одразу ж іх скідае ў свірне. Там жэ і выбівае од пылу ды од грязі, штоб у хату нічого чорного і непожаданого з собою не несці і штоб ёно ні до кого з хатніх не прыліпло. Закрываецца ж потому, што ёго неколі ешчэ ёгоны дзед так навучыў робіць і наказаў, штоб усім своім спадкоемцам перэдаваў под велікім секрэтом. Колі ж іншые людзі ўзнаюць. то тогда той оберэг перэстане дзействоваць і помогаць ёму і родным. Вось почэму закрываецца,а не од того, што суседку туды залучыў»[АПЗ(10)]; «Колі недзе раз у месяц ці ў два наш бацько збіраўса ў млын, то вельмі добрэ опранаўса. Маці жартовала, што як до венца поедзе. Але бацько быў важный і ні на што такое не зловаўса і не одказваў. Трымаўса, коб не посварыцца. Знаю добрэ. што навэть жычку на сорочку зверху повязваў. І колі надто доймалі, дык казаў, што ёго коні не последнія на выгоне, а скоціна не самая худая, што ёму соромно перод людзьмі показацца оборваным і ў нейкім лохмоцці. Тому і хоцеў вылучыцца. Потым, колі ўжо ёго смерць пошці наўсегда залучыла і ён одчуў, што ўміраць час прыспеў, то свойму старшому сыну перэказаў усе свое заговоры і оберэгі од хвороб да на тое, штоб добрэ скоціна плодзілася, штоб родныя нашы ніколі не хворэлі. А такжэ згадаў, што колі до млына станем ездзіць, то коб добрэ опраналіса, коб не свецілі голым целом, коб людзі абы-што не подумалі дурное. Колі, говорыў, сам сэбэ богато поведзеш,то і ўсе так про цебе стануць говорыць. Млынар такжэ ўважаць будзе і надалей. Ніколі не попікне, што ён тобе ў доўг змолоў ці ты ёму ў нечым зостаўса вінен. Знаючый быў чоловек, ні до кого за порадою не ходзіў, а до ёго постоянно прыходзілі і ўсім нешто радзіў, так не отпускаў» [АПЗ(11)].

Такім чынам, можна адзначыць, што млынар у свядомасці палешука здаўна асацыіраваўся з чалавекам, які меў пастаянны кантакт з сіламі зла, «чорнага» знахарства. Гэта неаднаразова падкрэслівалася ў шматлікіх вуснапаэтычных творах. Стараючыся засцерагчы сябе, сваю сямейку і род, чалавек мінулага выпрацаваў цэлы шэраг паднашэнняў і абярэгаў, што лішні раз пацвярджаецца пры аналізе запісаў, якія зроблены намі на Піншчыне падчас палявых экспедыцый апошніх гадоў. Яны пацвярджаюць высновы аб тым, што да нашых дзён у народзе працягваюць верыць у пэўныя абярэгі, стараюцца непрыкметна і пацiху зрабіць паднашэнні і г.д. Самае дзіўнае, што назвы змяніліся амаль ва ўсіх іх, а вось сутнасць засталася ранейшай.

Прынятыя скарачэнні: АПЗ – Асабістыя палявыя запісы

## ЛІТАРАТУРА

1. Ненадавец, А.М. Святло таямнічага вогнішча / А.М.Ненадавец. – Мінск: Беларусь 1993. – 286 с.

## GIFTS AND AMULETS ASSOCIATED WITH MILLERS IN PEOPLE'S CONSCIOUSNESS (BY THE FOLK MATERIALS FROM PINSK DISTRICT)

***A.M. NENADOVETS***

***Summary***

The article analyses the role of presents and protecting gifts connected with millers' activity in Belarus. Much attention is paid to consideration of early pagan relics which have survived unchanged up to the present moment. By way of comparison the author traces the role of millers in the life of the patriarchal village and their influence on people's self-consciousness. It is for the first time in Belarusian mythology that the problem is posed and interpreted, what enhances the value of the publication based on Pinsk folklore source.

*Паступіў у рэдакцыю 15 кастрычіка 2009 г.*

Полесгу